УДК 94(476)“653”

***П.Ф. ДЗМІТРАЧКОЎ***

# АБ РАЗВІЦЦІ ЭТНІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У СЯРЭДНЕВЯКОВЫ ПЕРЫЯД (VI – першая палова XIII ст.)

*У артыкуле прааналізаваны змены ў развіцці этнічных працэсаў на беларускіх землях у раннім сярэднявеччы, тыя асноўныя фактары, якія вызначалі гэтыя змены і, у прыватнасці, рассяленне ўсходніх славян і іх узаемадзеянне з балтамі. Балты з’явіліся субстратам, надаўшым усходнеславянскім плямёнам новыя этнічныя якасці. Разгледжа-*

Могилевский государственный университет им. А. А. Кулешова

*ны таксама сувязі паміж самімі ўсходнеславянскімі племяннымі ўтварэннямі як на рэгіянальным узроўні, так у і межах Старажытнай Русі. Зроблена выснова аб тым, што дрыгавічы і крывічы, якія ўмацаваліся на тэрыторыі Беларусі, як і іншыя ўсходнеславянскія плямёны, былі ўцягнутыя тады ў працэс фарміравання новай агульнаўсходнеславянскай супольнасці – старажытнарускай народнасці. Разам з тым аўтар лічыць, што няма падстаў пераацэньваць ступень этнічнага адзінства насельніцтва Старажытнай Русі, і зыходзіць з таго, што ў развіцці этнічных працэсаў на ўсходнеславянскіх землях перапляталіся супярэчлівыя тэндэнцыі, якія не толькі спрыялі кансалідацыі насельніцтва гэтых зямель, але і стрымлівалі яе. Асаблівасці ж, якія меліся ў племянных утварэннях, так і не былі пераадолены ў старажытнарускі перыяд.*

Пытанні этнічнай гісторыі, фарміравання ўсходнеславянскіх народаў, у тым ліку і беларускага, ужо даўно прыцягваюць увагу даследчыкаў. Актуальныя гэтыя пытанні і ў наш час, тым больш, што ў шэрагу аспектаў яны застаюцца нявырашанымі, носяць дыскусійны характар.

У дадзеным артыкуле робіцца спроба прааналізаваць асаблівасці развіцця этнічных працэсаў на беларускіх землях у сярэдневяковы перыяд і, у прыватнасці, разгледзець тыя змены, што адбыліся тут да сярэдзіны XIII ст.

Сярэдневяковы перыяд, на думку большасці сучасных даследчыкаў, у гісторыі еўрапейскіх краін пачаўся ў V – VI стст., і этнічныя працэсы, якія развіваліся ў той час, у значнай ступені былі звязаны з так званым “вялікім перасяленнем народаў”. Закранулі гэтыя працэсы і беларускія землі, дзе з’явіліся і замацаваліся ўсходнеславянскія племянныя ўтварэнні, вядомыя па пісьмовых крыніцах як дрыгавічы, радзімічы і крывічы, дакладней, частка крывічоў.

Ёсць падставы сцвярджаць, што ўсходнія славяне як новая этнічная супольнасць, меўшая спецыфічныя рысы сваёй мовы, культуры і нават асаблівасці фізічнага тыпу, вылучыліся ў рэгіёне, які ахопліваў паўднёвую Беларусь і паўночную Украіну, дзе склалася своеасаблівая археалагічная культура, атрымаўшая назву Прага-Карчак, ці проста пражская культура. Помнікі пражскай культуры былі адкрыты па рэках Прыпяць і Ясельда, усяго ж на Беларускім Палессі археолагамі вылучаны і апісаны звыш 50 селішчаў, могільнікаў і асобных месцазнаходжанняў, звязаных з гэтай культурай [1, с. 48].

Прыкладна ў V – VI стст. усходнія славяне сталі пранікаць і ў іншыя раёны Беларусі на поўнач ад Прыпяці, дзе знаходзіліся балцкія плямёны. Так, славянскі ўплыў прасочваецца ў помніках калочынскай археалагічнай культуры, якая ахоплівала беларускае Падняпроўе, Пасожжа і некаторыя суседнія тэрыторыі. Уплыў усходніх славян адчула на сабе і банцараўская культура сярэдняй і паўночнай Беларусі, а таксама роднасная ёй тушамлінская культура Смаленшчыны, хоць у цэлым гэтыя археалагічныя культуры былі балцкія [2, с. 125-128].

Далейшае развіццё этнічныя працэсы на беларускіх землях атрымалі ў VIII ст. З гэтай датай звязана масавае рассяленне славян, іх усходняй галіны па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Увогуле працэс засялення і асваення славянамі беларускіх зямель быў даволі працяглым і меў некалькі хваляў. Г. Штыхаў, напрыклад, гаворыць аб трох такіх хвалях, першую з каторых адносіць да VI – VII стст., другую – да VIII – IX, трэцюю – да X – XI стст. Э. Загарульскі сцвярджае, што масавае рассяленне ўсходніх славян на тэрыторыі Беларусі прыпадае на IX – X стст.

У ходзе гэтых рассяленняў нейкая частка балтаў была адсунута на поўнач, паўночны захад, але многія засталіся на ранейшых месцах і былі асіміляваныя славянамі, (а некаторыя балцкія плямёны захаваліся ў выглядзе астраўкоў сярод славянскага насельніцтва), што вызначыла асаблівасці далейшага развіцця этнічных працэсаў на тэрыторыі нашай краіны. Невыпадкова шэраг навукоўцаў разглядаюць балтаў нават у якасці субстрата этнагенезу беларусаў і зыходзяць з

таго, што менавіта славянізацыя балцкага насельніцтва і змешванне з ім прышлых усходнеславянскіх плямёнаў дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў абумовіла ўзнікненне беларускага этнасу [3].

Пад уздзеяннем балтаў усходнія славяне, якія рассяліліся на беларускіх землях, набылі новыя этнічныя рысы, таму нельга разглядаць іх як проста "плямёны" ці "саюзы плямён". Гэта былі ўжо новыя этнічныя супольнасці, меўшыя рысы своеасаблівых "протанароднасцей". "Яны – не плямёны і не саюзы плямёнаў, – адзначае М. Піліпенка, – а протанароднасці, якія сфарміраваліся на пачатковым этапе раннекласавага грамадства" [4, с. 45]. Такую ацэнку дрыгавічам, радзімічам і крывічам дае і вядомы беларускі гісторык Г. Штыхаў. Больш таго, ён разглядае іх у якасці прабеларускіх этнічных утварэнняў. "Гэта былі якасна новыя прабеларускія ўтварэнні, – піша ён, – у якіх пераважалі славянскія рысы і якія займалі своеасаблівае месца сярод іншых усходнеславянскіх этнасаў. Увабраўшы ў сваю культуру шэраг балцкіх элементаў, яны адрозніваліся спецыфічнымі рысамі славянскай культуры, што ўзніклі пад уздзеяннем балтаў" [5, с. 34].

Уплыў балцкага субстрату на этнічныя працэсы на беларускіх землях пацвярджаюць і антрапалагічныя дадзеныя, і, у прыватнасці, той факт, што паміж беларусамі і літоўцамі маецца антрапалагічнае падабенства [6]. Ды і назвы ўсходнеславянскіх супольнасцей, якія замацаваліся на тэрыторыі Беларусі, на думку многіх даследчыкаў, маюць уплыў субстрата, г.зн. балтаў.

Такім чынам, балта-славянскі сінтэз стаў важнейшым фактарам, які вызначыў асаблівасці развіцця этнічных працэсаў на беларускіх землях. Безумоўна, мы павінны ўлічваць і тое, што асіміляцыя славянамі балтаў у розных частках Беларусі адбывалася неадначасова і з неаднолькавай інтэнсіўнасцю. Калі ў адных месцах славянізацыя мясцовага балцкага насельніцтва завяршылася да канца I тыс. н.э., то ў іншых яна праходзіла ў XII – XIII стст., а дзе-нідзе нават і пазней. У некаторых жа раёнах Беларусі балты не былі цалкам асіміляваныя і надалей, як ужо адзначалася, утваралі астраўкі сярод славянскага насельніцтва [7, с. 61-72]. З другога боку, нельга зводзіць асаблівасці развіцця этнічных працэсаў на беларускіх землях у раннім сярэднявеччы толькі да ўплыву балтаў. Пэўнае ўздзеянне на гэтыя працэсы аказалі фіна-угры, скандынавы, готы, кельты, іранскія этнічныя групы [8, с. 28-33].

Вывучаючы этнічныя працэсы, нельга абысці і сувязі паміж самімі ўсходнеславянскімі супольнасцямі. Узмацненню такіх сувязей спрыялі змены ў эканамічным жыцці, сацыяльнай сферы, зараджэнне і развіццё дзяржаўнасці, знешнія фактары. Пры гэтым сувязі на ўсходнеславянскіх землях развіваліся як на рэгіянальным узроўні, так і на прасторах усёй Усходняй Еўропы і, у прыватнасці, у межах Старажытнарускай дзяржавы, у якой ужо да канца X ст. апынуліся ўсходнія славяне.

На значэнне рэгіянальных сувязей у развіцці этнічных працэсаў у той час указвалі навукоўцы ўжо ў дарэвалюцыйнай Расіі. Так, некаторыя з іх вылучалі раёны Падзвіння і Верхняга Падняпроўя, населеныя крывічамі, і сцвярджалі, што менавіта тут гэтыя працэсы атрымалі найбольш інтэнсіўнае развіццё, у выніку чаго і склаўся, узнік беларускі этнас. На такой выснове будавалася т. зв. "крывіцкая тэорыя" паходжання беларусаў [9, с. 298].

Вядомы беларускі даследчык У. Пічэта на тэрыторыі Беларусі і прылеглых да яе зямель вылучаў пяць этнаўтваральных цэнтраў, ці ядраў. Першы ён бачыў у басейне Прыпяці, дзе адбылося, на яго думку, змешванне дрыгавіцкіх элементаў з элементамі паўднёварускіх драўлян і валынян і неславянскіх літоўска-ятвяжскіх элементаў. Другі цэнтр У. Пічэта размяшчаў у басейне сярэдняга, верхняга і часткова ніжняга цячэння Заходняй Дзвіны і Бярэзіны. У склад гэтага цэнтра

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

ўваходзілі землі заходнедзвінскіх крывічоў, у тым ліку палачан і паўночных дрыгавічоў, якія адчулі ўздзеянне літоўска-латышскіх і фінскіх племянных элементаў. Трэці цэнтр, на думку У. Пічэты, ахопліваў Верхняе Падняпроўе з племяннымі крывіцкімі элементамі ў аснове, часткова ў яго склад ўваходзілі і верхнесожскія радзімічы. Чацвёрты этнічны цэнтр У. Пічэта звязваў з Чорнай Руссю, які ахопліваў басейн Верхняга Нёмана. На гэтай тэрыторыі сустрэліся полацкія крывічы, прыпяцкія дрыгавічы і літоўскія плямёны. Пяты этнічны цэнтр У. Пічэта змясціў у Берасцейскай зямлі, дзе адбылося ўзаемадзеянне дрыгавічоў і валынян [10, с. 615-616].

Рэгіянальныя сувязі ў якасці важнага фактару развіцця этнічных працэсаў на беларускіх землях улічвалі і іншыя навукоўцы. Так, М. Ермаловіч звязваў этнаўтваральныя працэсы на тэрыторыі Беларусі перш за ўсё з Полацкім княствам. Менавіта тут, на яго думку, адбывалася ўзаемапранікненне і мяшанне дрыгавіцкага, крывіцкага і радзіміцкага насельніцтва, асіміляваўшага балтаў, у выніку чаго сфарміравалася асобная этнічная супольнасць – палачане. "Яны, – адзначае М. Ермаловіч, – з'явіліся першай па часе мадэллю беларусаў" [11, с. 50]. Гэтыя ж працэсы, лічыў М. Ермаловіч, развіваліся ў той час і ў Папрыпяцці, і ў Панямонні, дзе таксама адбывалася ўзаемапранікненне і мяшанне ўсходнеславянскіх плямёнаў і асіміляцыя імі балтаў. М. Ермаловіч вылучыў на тэрыторыі Беларусі фактычна тры этнаўтваральныя цэнтры.

Аднак М. Ермаловіч, як і некаторыя іншыя беларускія навукоўцы, аналізуючы этнічныя працэсы часоў Старажытнай Русі, недаацэньвалі сувязі, якія развіваліся ў межах гэтай дзяржавы, на ўсіх землях, занятых усходнімі славянамі. Гэта быў ужо другі ўзровень этнічных працэсаў, які мы не можам ігнараваць.

Развіццю такіх сувязей, як ужо адзначалася, спрыялі многія фактары, і перш за ўсё тое, што ўсходнія славяне мелі агульнае паходжанне, адзіную мову (пры наяўнасці дыялектаў), шмат агульных рыс у культуры, побыце. Развіваліся і гандлёвыя сувязі, іншыя кантакты. Важную ролю ў збіранні, згуртаванні ўсходнеславянскіх зямель адыграла і сама дзяржава – Кіеўская Русь. Дзяржаўны фактар увогуле з'яўляецца адным з асноўных у этнаўтваральных працэсах. У дзяржаве, як вядома, прадстаўлены і цесна пераплятаюцца самыя розныя інтарэсы людзей, і яна ўжо з моманту свайго ўзнікнення выступала як адна з важнейшых форм самаарганізацыі грамадства. Пры гэтым дзяржава імкнулася не толькі ўцягнуць у сваю арбіту як мага больш родаплемянных і этнічных груп, але і аб'яднаць іх у адзінае палітыка-юрыдычнае супольніцтва, падпарадкаваць нейкаму універсальнаму пачатку ў межах пэўных тэрыторый [12, с. 100-101].

У такой якасці дзяржава выступала і на ўсходнеславянскіх землях. Ужо племянныя княжанні як першасныя дзяржаўныя ўтварэнні разбуралі лакальныя рысы і асаблівасці, з'ядноўвалі насельніцтва па тэрытарыяльнай прыкмеце, фарміравалі агульныя інтарэсы і прадстаўленні. Не меншай была роля і Русі. Нягледзячы на тое што гэтая дзяржава была нетрывалая, праіснавала кароткі час, яна спрыяла ўзмацненню сувязей зямель, якія ў яе ўваходзілі. Такую ж ролю адыгрывала ў той час і хрысціянская царква, якую можна разглядаць у якасці аднаго з асноўных этнаўтваральных, кансалідуючых фактараў [13, с. 58-61].

Улічваючы ўсё гэта, шмат якія з навукоўцаў прыйшлі да высновы аб тым, што ў межах дзяржавы Русь на аснове рэгіянальных этнічных утварэнняў складвалася новая супольнасць, атрымаўшая назву – усходнеславянская "старажытнаруская народнасць". Такой думкі прытрымліваліся некаторыя вучоныя ўжо ў XIX ст. Актыўна распрацоўвалася пытанне аб старажытнарускай народнасці і ў савецкі час. Канцэпцыя старажытнарускай народнасці, як устаноўлена даследаваннямі апошніх гадоў, стала фарміравацца ў гістарычнай навуцы СССР у дру-

гой палове 30-х – пачатку 40-х гг. XX ст. Сам жа тэрмін "народнасць" у адносінах да ўсходніх славян у якасці этнічнай катэгорыі ўвёў у навуковы ўжытак дырэктар Інстытута матэрыяльнай культуры СССР М. Артамонаў, выступаючы на адной з нарад у АН СССР у 1940 г. [14, с. 177]. Вялікі ўклад у распрацоўку гэтай канцэпцыі ўнеслі Н. Дзяржавін, С. Юшкоў, В. Маўродзін, Б. Грэкаў, П. Траццякоў, С. Токараў. Яе падтрымліваюць і многія сучасныя навукоўцы, аб чым сведчыць дыскусія, якая адбылася ў 2002 г. на старонках расійскага часопіса "Родина". Выступаючы ў час гэтай дыскусіі, гісторык В. Сядоў адзначыў: "Этнамоўнае, палітычнае і культурнае адзінства славян Усходняй Еўропы X – XII стст. дае ўсе падставы гаварыць аб складванні ў Старажытнай Русі асобнага славянскага этнасу – старажытнарускай народнасці". Пры гэтым В. Сядоў (як і іншыя ўдзельнікі дыскусіі) падкрэсліваў, што "Старажытная Русь прадстаўляла сабою агульнасць, якая была згуртавана ў значна большай ступені", чым некаторыя еўрапейскія палітычныя ўтварэнні, напрыклад, дзяржава Каралінгаў, і што "сустракаемыя ў сучаснай літаратуры сцвярджэнні аб станаўленні ўкраінцаў, беларусаў і рускіх непасрэдна з праславянскай супольнасці трымаюцца не на ўсёй суме дадзеных, якія маюцца ў распараджэнні сучаснай навукі, а на асобных момантах, спецыяльна падабраных "пад канцэпцыю", і таму не з'яўляюцца навуковымі" [15, с. 7, 13].

Канцэпцыя старажытнарускай народнасці мае шмат прыхільнікаў і ў Беларусі. Гэтую канцэпцыю, напрыклад, падтрымлівае вядомы беларускі гісторык Э. Загарульскі. Яго погляды на дадзеную праблему выкладзены ў многіх публікацыях, у тым ліку і ў вучэбным дапаможніку "Заходняя Русь: IX – XIII стст." (Мн., 1998). "... Старажытнаруская народнасць – гэта гістарычны факт, – піша Э. Загарульскі. – Яна ў поўнай меры адпавядае тым патрабаванням і адзнакам, якія ўласцівы такому тыпу гістарычнай і этнічнай супольнасці" [16, с. 218].

Трэба адзначыць, што прыхільнікі існавання старажытнарускай народнасці ў сваёй аргументацыі абапіраюцца на многія гістарычныя факты, і перш за ўсе на тыя, якія сведчаць аб усведамленні насельніцтвам Старажытнай Русі сябе адзіным народам – "русинами", "русичами", "руськими". Сапраўды, такія назвы зафіксаваны ў шматлікіх крыніцах (ранейшая ж племянная самаідэнтыфікацыя стала знікаць з сярэдзіны XII ст.). Даволі шырока выкарыстоўваліся тады і такія тэрміны, як "Русь", "Руская зямля", у якіх адлюстроўвалася разуменне адзінства дзяржавы і яе тэрыторыі. Спачатку такія тэрміны адносіліся да Сярэдняга Падняпроўя, а ўжо ў XI – XII стст. сталі распаўсюджвацца і на іншыя ўсходнеславянскія, у тым ліку і беларускія землі. Так, у "Аповесці мінулых гадоў" словы "Русь", "Руская зямля", "руськие" ўзгадваюцца больш за 270 разоў, пры гэтым у большасці выпадкаў яны адносяцца да ўсіх усходнеславянскіх плямёнаў і іх зямель [17, с. 24]. Усведамленне агульнасці Русі адлюстравалася і ў іншых творах: "Слове о полку Игореве", "Слове о Законе и Благодати", "Слове о погибели русской земли", "Повести о разорении Рязани Батыем". У тэксце "Слова о полку Игореве" тэрмін "Руская зямля" сустракаецца 21 раз. Дарэчы, тут жа прама гаворыцца і аб тым, што Полацкая зямля, княства Усяслава, – гэта таксама руская зямля. Вядомы тады быў і тэрмін "народ рускі", яго ўпершыню выкарыстаў кіеўскі мітрапаліт Іларыён у "Слове о Законе и Благодати" (твор XII ст.). Як і іншыя, гэты твор быў пранізаны глыбокім патрыятызмам, гонарам за землі рускія, русічаў, якія "мужеством и храбростью прославились в странах многих, и победами и крепостью поминаются ныне и прославляются. Ибо не в худой и неведомой земле владычествовали, но в Русской, что ведома и слышима всеми четырьмя концами земли" [18, с. 21]. Варта зазначыць, што тэрмін "Русь" захаваўся і пасля распаду Старажытнарускай дзяржавы і выкарыстоўваўся ў дачыненні да ўсіх яе зямель не

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

толькі ў XIII ст., але і пазней. "Руская народная маса, – пісаў Б. Грэкаў, – дзе б яна не знаходзілася, якой бы ўладзе яна не падпарадкоўвалася, не забывала ніколі сваёй этнічнай агульнасці" [19, с. 9].

Усе гэтыя факты, безумоўна, нельга абысці, вывучаючы развіццё этнічных працэсаў у разглядаемы перыяд. Гэтыя працэсы спрыялі фарміраванню агульнаўсходнеславянскай супольнасці, атрымаўшай назву "старажытнаруская народнасць". Але было б няправільна і пераацэньваць ступень этнічнага адзінства насельніцтва Русі. Гэта адзінства было даволі адносным. На этапе гістарычнага развіцця, калі адбываўся пераход ад першабытнага грамадства да грамадства раннефеадальнага, этнічныя супольнасці ўвогуле не былі маналітнымі, трывалымі, што было характэрна і для іншых рэгіёнаў еўрапейскага кантыненту. Таму нельга перабольшваць і самаідэнтыфікацыю насельніцтва Старажытнай Русі, асабліва сельскага, якое складала яго асноўную частку (больш за 90%). Гэта самаідэнтыфікацыя мела рэлігійны характар і, па сутнасці, з'яўлялася этнаканфесійнай. Важнейшым чыннікам, які кардынальна мяняў этнічную племянную самаідэнтыфікацыю ўсходніх славян, – адзначае І. Марзалюк, – была іх хрысціянізацыя па "рускім", праваслаўным узоры [20]. Носьбітам агульнаўсходнеславянскай старажытнарускай этнічнай самасвядомасці было ў асноўным гарадское насельніцтва, бо гарады ў той час адыгрывалі камунікатыўную ролю, для яго была характэрна адкрытасць, уласцівасць пераадольваць замкнёнасць, уключаць у сваю сферу людзей рознага паходжання. Высокім узроўнем ідэнтычнасці характарызаваліся элітныя княжацка-баярскія колы, але іх самасвядомасць мела саслоўна-дзяржаўную аснову, і таму многія даследчыкі разглядаюць гэтыя колы ў якасці "палітычнага народу" Кіеўскай Русі.

Пры аналізе этнічных працэсаў на ўсходнеславянскіх землях у старажытнарускі перыяд, на наш погляд, трэба ўлічваць тое, што ў іх развіцці перапляталіся супярэчлівыя тэндэнцыі. Адна з іх адлюстроўвала з'явы, якія спрыялі кансалідацыі насельніцтва гэтых зямель, узмацненню агульных пачаткаў, сацыякультурнага сінтэзу, а другая, насупраць, была звязана са з'явамі дыферэнцыяцыі, мясцовымі асаблівасцямі ў мове, культуры, укладзе жыцця. Таму можна пагадзіцца з думкаю беларускага гісторыка Л. Лыча, які адзначаў, што этнакультурная спецыфіка плямёнаў, якія апынуліся ў складзе Кіеўскай Русі, не магла быць пераадолена за час яе існавання. "У старажытнарускай народнасці, – піша ён, – працэсы этнічнай кансалідацыі не дайшлі да той мяжы, каб зусім скасаваць значэнне былых племянных адрозненняў і своеасаблівасцяў" [21, с. 14].

Істотна важным фактарам, які падарваў адзінства ўсходнеславянскіх княстваў, стала раздробленнасць Русі, а ў далейшым уключэнне іх у новыя дзяржаўныя ўтварэнні – Маскоўскую Русь і Русь Літоўскую (Вялікае княства Літоўскае). Неабходна улічваць і ролю этнічных субстратаў, якімі былі балты, фіна-угры і цюркскія народы. Этнічныя субстраты, на думку многіх даследчыкаў (В. Сядова, Э. Загарульскага інш.), у значнай ступені стварылі глебу, на якой фарміраваліся беларуская, украінская і руская народнасці. Для станаўлення беларускай народнасці важнае значэнне мелі працэсы, што развіваліся ў дзвюх дыялектнаэтнаграфічных зонах Русі – падзвінска-падняпроўскай і прыпяцкай, або палескай. Існаванне такіх зон было абгрунтавана М. Піліпенкам [22, с. 128].

Такім чынам, у сярэдневяковы перыяд у этнічнай гісторыі Беларусі адбыліся важныя змены. Яны былі абумоўлены рассяленнем на беларускіх землях усходніх славян і іх узаемадзеяннем з балтамі, якія знаходзіліся тут. Менавіта у выніку гэтага ўзаемадзеяння склаліся этнічныя супольнасці дрыгавічоў, радзімічаў і крывічоў, а этнічныя працэсы набылі субстратны характар. Разам з тым гэтыя супольнасці засталіся славянскімі і захавалі асноўныя рысы сваёй культу-

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

ры, укладу жыцця. Няма падстаў перабольшваць і іх самастойнасць, адрываць ад іншых усходнеславянскіх утварэнняў. Эканамічныя, сацыяльныя і палітычныя змены на землях, якія занялі ўсходнія славяне, прывялі да таго, што ўсе яны былі ўцягнуты ў працэс фарміравання новай супольнасці – агульнаусходнеславянскай старажытнарускай народнасці. І хоць у гэтай супольнасці і не былі пераадолены мясцовыя этнічныя адметнасці і яна, па сутнасці, не склалася (яе фарміраванне так і не завяршылася), з ёю генетычна звязаны вытокі беларускага этнасу, яго гістарычныя карані. Сам жа беларускі этнас (у форме народнасці) узнік пазней.

*ЛІТАРАТУРА*


1. ***Вяргей, В.С.*** Гісторыя даследавання старажытнасцей пражскай культуры ў Беларусі / В.С. Вяргей // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 6 – 7 кастрычніка 1999. – Мн., 2000.
2. ***Штыхаў, Г.*** Балты і славяне ў VI – VIII стст. / Г. Штыхаў // Гісторыя Беларусі: у 6 т. – Т. 1: Старажытная Беларусь: ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст.– Мн., 2000.
3. Пытанні аб ролі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў, як вядома, былі ўзняты савецкім расійскім гісторыкам В. Сядовым у 60 – 70-я гг. мінулага стагоддзя, і вакол іх разгарнулася навуковая дыскусія на старонках часопіса “Советская этнография”. Аднак “балцкая” тэорыя паходжання беларусаў знайшла не толькі прыхільнікаў. Супраць яе выступілі шэраг навукоўцаў, таму што многія факты этнічнай гісторыі беларусаў не ўкладаюцца ў гэтую тэорыю. Найбольш глыбокі і грунтоўны аналіз гэтых фактаў, ролі балцкага субстрату ў этнагенезе беларусаў быў зроблены ў публікацыях выдатных этнографаў таго часу: П. Траццякова, М. Грынблата, Г. Хабургаева, В. Бандарчыка, М. Піліпенкі і іншых даследчыкаў. Увогуле пытанне славянізацыі балтаў у многіх аспектах застаецца дыскусійным і нават заблытаным. Аб гістарыяграфіі дадзенай праблемы гл.: ***Дучыц, Л.У.*** Балцкаславянская праблема паходжання беларусаў у гістарыяграфіі // Гістарыяграфія гісторыі Беларусі: стан і перспектывы развіцця: матэрыялы навуковай канферэнцыі, прысвечанай 70-годдзю Інстытута гісторыі НАН Беларусі, Мінск, 6-7 кастрычніка 1999 г.
4. ***Пилипенко, М.Ф.*** Возникновение Белоруссии. Новая концепция / М.Ф. Пилипенко. – Мн., 1991.
5. ***Штыхаў, Г.*** Насельніцтва зямель Беларусі ў IX – XIII стст. (вытокі беларускай народнасці) / Г. Штыхаў // З глыбі вякоў. Наш край. Гісторыка-культуралагічны зборнік. – Мн., 1992. Трэба, аднак, адзначыць, што не ўсе сучасныя навукоўцы лічаць усходнеславянскія племянныя групоўкі этнічнымі ўтварэннямі. На думку Э. Загарульскага, летапісныя плямёны – гэта прадстаўнікі адной славянскай супольнасці, меўшыя толькі этнаграфічныя асаблівасці, якія склаліся ў выніку асіміляцыйных і міксацыйных працэсаў. Гл.: ***Загарульскі, Э.М.*** Заходняя Русь: IX – XIII стст.: Вучэбны дапаможнік / Э.М. Загарульскі. – Мн., 1998. – С. 30.
6. Але есць меркаванні і аб тым, што міграцыі не прывялі да істотнага змянення фізічнага тыпу насельніцтва Беларусі. Гл.: ***Емельянчык, В.*** Роля міграцый у фарміраванні антрапалагічнага складу беларусаў (да гісторыі праблемы) / В. Емельянчык // Гістарычна-археалагічны зборнік. – 1997. – № 11. Апошнія даследаванні сведчаць, што сучаснае карэннае насельніцтва Беларусі з'яўляецца нашчадкам мясцовых старажытных жыхароў. Так, беларускі даследчык А. Мікуліч сцвярджае, што “... беларусы (папуляцыя карэнных жыхароў) вядуць свой радавод цягам не меней як 130 – 140 каленаў, гэта значыць пачынаючы амаль за 1,5 тыс. гадоў перад Н. Х.” Падр. гл.: ***Мікуліч, А.*** Беларусы ў генетычнай прасторы. Антрапалогія этнасу / А. Мікуліч. – Мн., 2005.
7. ***Зайкоўскі, Э.*** Балты Цэнтральнай і Усходняй Беларусі ў сярэднявеччы / Э. Зайкоўскі // Спадчына. – 1999. – № 1.
8. Гл.: ***Віцязь, С.*** Поліэтнічная (індаеўрапейская) канцэпцыя этнагенезу беларусаў і яго перыядызацыя / С. Віцязь // Гісторыя, культуралогія, мастацтвазнаўства:


Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

матэрыялы III Міжнароднага кангрэсу беларусістаў "Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый", 21-25 мая, 4-7 снежня. – Мн., 2001.
9. Беларусы. Т. 3: Гісторыя этналагічнага вывучэння. – Мн., 1999.
10. ***Пичета, В.И.*** Белоруссия и Литва XV – XVI вв. / В.И. Пичета. – М., 1961.
11. ***Ермаловіч, М.*** Старажытная Беларусь: Полацкі і Навагародскі перыяды / М. Ермаловіч. – Мн., 1990.
12. ***Гаджиев, К.С.*** Политическая наука / К.С. Гаджиев. 2-е изд. – М., 1995.
13. Падраб. гл.: ***Загорульский, Э.М.*** Роль церкви в утверждении этнического самосознания в Древней Руси: материалы научно-богословской конференции, посвященной памяти преподобномученика Афанасия, игумена Брестского и 400-летию Брестских церковных соборов, Брест, 16-19 сентября 1996 г. – Мн., 1997.
14. ***Мандрик, М.В.*** Генезис концепции древнерусской народности в исторической науке СССР (1930-е – первая половина 1940-х годов) / М.В. Мандрик, Н. Юсова // Отечественная история. – 2006. – № 2.
15. Круглый стол: Древнерусское единство: парадоксы восприятия // Родина. – 2002. – № 11-12.
16. ***Загарульскі, Э.М.*** Заходняя Русь: IX – XIII стст. Вучэбны дапаможнік. Гл. таксама: ***Загарульский, Э.М.*** Из истории возникновения древнерусской народности / Э.М. Загарульскі // Веснік БДУ імя Ул.І. Леніна. – Сер. 3. – 1991. – № 2.
17. ***Старостенко, В.В.*** Становление национального самосознания белорусов: этапы и основополагающие идеи (X – XVII вв.): Монография / В.В. Старостенко. – Могилев, 2001.
18. Там жа.
19. ***Греков, Б.Д.*** Киевская Русь / Б.Д. Греков. – М., 1953.
20. Падраб. гл.: ***Марзалюк, І.А.*** Да пытання аб этнічнай і палітычнай свядомасці ўсходнеславянскага насельніцтва ў 10 – 13 стст. / І.А. Марзалюк // Гістарычны Альманах. Гародня. – 1998. – № 1. – С. 4-13.
21. ***Лыч, Л.*** Гісторыя культуры Беларусі / Л. Лыч, У. Навіцкі. – Мн., 1996. Трэба заўважыць, што некаторыя навукоўцы прапануюць у адносінах да насельніцтва Старажытнай Русі выкарыстоўваць не паняцце "народнасць", а якія-небудзь іншыя, напрыклад, "усходнеславянскі этнас, ці суперэтнас", "усходнеславянская этнакультурная супольнасць". Гл.: ***Дворниченко, А.*** Славянская общность: альтернативы и мифы / А. Дворниченко, А. Филюшкин // Родина. – 2007. – № 6.
22. ***Пилипенко, М.Ф.*** Возникновение Белоруссии. Новая концепция / М.Ф. Пилипенко. – Мн., 1991.

Паступіў у рэдакцыю 21.05.2007 г.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова